**ЛЫЗІКАЎ** Мікалай Фядосавіч (н. 13.12.1920, в. Бароньки Клімавіцкага пав. Гомельскай губ.), беларускі савецкі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р мед. н., праф. (1969). З сялян. Чл. КПСС з 1942. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1951), дзе і працуе на кафедры акушэрства і гінекалогіі (заг. з 1959). Асн. працы па пытаннях афтальмабленарэі нованароджаных, ускладненнях цяжарнасці і родаў.

*Тв.:* Принципы ведения беременности и родов, осложненных преждевременным излитием околоплодных вод, «Акушерство и гинекология», 1969, № 7; Преждевременное отхождение околоплодных вод. Мн., 1971.